УДК 7.072:378.4(476.5-25)“1947/2021”

# Вера Паўлаўна Пракапцова (1947–2021): спатканні з Віцебскам

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*В Артыкул прысвечаны вядомаму беларускаму мастацтвазнаўцу, стваральніку школы кампаратыўнага мастацтвазнаўства, доктару мастацтвазнаўства, прафесару Веры Паўлаўне Пракапцовай. Навуковае і творчае жыццё яе на працягу больш чым за сорак гадоў было цесна звязана з кафедрай беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Разам з тым на працягу амаль двух апошніх дзесяцігоддзяў В.П. Пракапцова падтрымлівала тоесныя сувязі з мастацка-графічным факультэтам ВДУ імя П.М. Машэрава, з віцебскімі навукоўцамі. З яе боку аказвалася неацэнная навукова-метадычная дапамога ў арганізацыі магістратуры і аспірантуры па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя мастацтва» ў віцебскім універсітэце. З самага пачатку стварэння ў ВДУ імя П.М. Машэрава навукова-практычнага часопіса “Мастацтва і культура” В.П. Пракапцова з’яўлялася актыўным членам рэдакцыйнай калегіі, а з 2019 года – намеснікам галоўнага рэдактара дадзенага выдання. Аўтар вялікай колькасці кніг, навуковых публікацый па мастацтвазнаўстве, у тым ліку шэрагу артыкулаў, прысвечаных гісторыі віцебскай мастацкай школы, яна шмат зрабіла для беларускай гуманітарыстыкі. За доўгія гады сваёй навуковай працы і педагагічнай дзейнасці В.П. Пракапцова выхавала не адну плеяду беларускіх вучоных-мастацтвазнаўцаў.*

*У артыкуле разглядаюцца мастацкія праекты, што рэалізоўваліся ў Віцебску пры падтрымцы В.П. Пракапцовай, а таксама шырокі спектр навукова-творчых мерапрыемстваў, у якіх даследчыца прымала непасрэдны ўдзел.*

***Ключавыя словы:** Вера Паўлаўна Пракапцова, кампаратыўнае мастацтвазнаўства, тэорыя і гісторыя мастацтвазнаўства, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, ВДУ імя П.М. Машэрава, П.В. Масленікаў, віцебская мастацкая школа.*

*(Искусство и культура. – 2022. – № 3(47). – С. 5–11)*

# Vera Paulauna Prakaptsova (1947–2021): Meetings with Vitebsk

***Tsybulski M.L.***
*Education Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*The article is concerned with the outstanding Belarusian art critic, the creator of the school of comparative art studies, Doctor of Art Studies, Professor Vera Paulauna Prakaptsova. Her scientific and creative life during more than forty years was closely connected with the Department of Belarusian and World Art Culture of Belarusian State University of Culture and Arts. At the same time, during the last two decades V.P. Prakaptsova maintained close links with Vitebsk State P.M. Masherov University Art Faculty, with Vitebsk researchers. She rendered valuable scientific and methodological assistance in setting up Theory and History of Art master’s school and the postgraduate school at Vitebsk State University. From the establishment of “Art and Culture” scientific and practical journal at Vitebsk State P.M. Masherov University V.P. Prakaptsova was an active editorial board member and, since 2019 she was Deputy Chief Editor of the Journal. Being the author of numerous books, art critic scientific publications, including those on the history of Vitebsk art school she did a lot for Belarusian Humanities. Over the long years of her scientific work and teaching V.P. Prakaptsova trained a lot of Belarusian art critics.*

*The article considers art projects which were implemented in Vitebsk with V.P. Prakaptsova’s support as well as a vast number of scientific and art events in which the researcher participated.*

***Key words:** Vera Paulauna Prakaptsova, comparative art studies, theory and history of art studies, Belarusian State University of Culture and Arts, Vitebsk State P.M. Masherov University, P.V. Maslenikau, Vitebsk art school.*

*(Art and Cultur. – 2022. – № 3(47). – P. 5–11)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

Год таму – 13 верасня 2021 года пайшла з жыцця доктар мастацтвазнаўства (2000), прафесар (1997) Вера Паўлаўна Пракапцова. Яна была яркім, таленавітым, рознабакова адораным інтэлектуалам, верным сваім прынцыпам чалавекам, сапраўдным інтэлігентам і патрыётам, у якога душа баліць за інтарэсы справы. Навуковае і творчае жыццё яе на працягу больш чым за сорак гадоў было цесна звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Разам з тым амаль два апошнія дзесяцігоддзі В.П. Пракапцова падтрымлівала тоесныя сувязі з мастацка-графічным факультэтам ВДУ імя П.М. Машэрава, з Віцебскам. З яе боку аказвалася неацэнная навукова-метадычная дапамога ў арганізацыі вучэбна-навуковай дзейнасці ў віцебскім універсітэце. У Віцебску ж рэалізоўваліся мастацкія праекты, да якіх мела непасрэднае дачыненне В.П. Пракапцова. З самага пачатку стварэння ў ВДУ імя П.М. Машэрава навукова-практычнага часопіса “Мастацтва і культура” В.П. Пракапцова з’яўлялася актыўным членам рэдакцыйнай калегіі, а з 2019 года – намеснікам галоўнага рэдактара дадзенага выдання. Аўтар шэрагу артыкулаў, прысвечаных гісторыі віцебскай мастацкай школы.

“Па маім жыцці Віцебск праходзіў метрычна, рытмічна, перыядычна...” – менавіта так пачала сваё інтэрв’ю віцебскаму тэлебачанню ў 2014 годзе В.П. Пракапцова[1]. Сапраўды, горад над Дзвіной, віцебская мастацкая школа выклікалі не толькі навуковы інтарэс у вядомага мастацтвазнаўцы, але і з’яўляліся арганічнай часткай жыцця блізкіх і дарагіх ёй людзей.

Мэта артыкула – прааналізаваць жыццёвы, навуковы і творчы шлях вядомага мастацтвазнаўцы В.П. Пракапцовай, у межах якога адлюстраваць і “віцебскі след” даследчыцы.

**З генетычнай памяці.** Вера Пракапцова (Масленікава) нарадзілася 29 студзеня 1947 года ў г. Мінску ў сям’і славутага беларускага мастака, мастацтвазнаўцы і педагога Паўла Васільевіча Масленікава (1914–1995). Як вядома, вучоба П.В. Масленікава ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме ў 1934–1938 гг. стала асновай яго прафесійнай дзейнасці. Канешне, зразумець і па сапраўднаму ацаніць ролю, якую адыграў Віцебск у фарміраванні творчай асобы П.В. Масленікава, В.П. Пракапцова зможа значна пазней, ужо ў сталым узросце, калі ў яе рукі трапяць яго дзённікі. Гэтыя запісы, як і ўспаміны бацькі аб сваім жыцці, стануць першаасновай будучай кнігі аб ім, якую В.П. Пракапцова пачне пісаць ці не адразу пасля яго смерці.

У грунтоўным і шматаспектным даследаванні “Павел Масленников. Портрет художника в зеркале времени: воспоминания, документы, альбом-каталог”, шматлікіх артыкулах Віцебск і ўспаміны аб ім сапраўды занялі пачэснае месца. І зусім не выпадова. Павел Масленікаў ва ўласных дзённіках адзначаў, што “ў тыя гады Віцебск не толькі захоўваў славу «мекі» авангарднага мастацтва, (...) але і развіваў традыцыі мастацка-адукацыйнага цэнтра” [1]. У тэхнікуме ў той час была, можна сказаць, багема, як узгадваў мастак. “У новай для Паўла Масленікава віцебскай атмасферы таго часу было ап’яненне творчым уздымам, навізной, напружанасцю, выклікам традыцыям і надзеяй на пераўтварэнне жыцця. Для яго гэта быў час фарміравання новай эстэтычнай свядомасці” [2, с. 106].

У час працы В.П. Пракапцовай над кнігай пра бацьку яна неаднойчы наведвала мясціны, звязаныя з асобнымі “вехамі” ў жыцці і творчасці мастака. “Ужо быў напісаны фрагмент тэксту з маімі асабістымі ўспамінамі, і я шукала матэрыялы, звязаныя з навучальнымі ўстановамі, дзе вучыўся бацька, з людзьмі, якія яго вучылі і аказалі ўплыў на станаўленне яго творчай індывідуальнасці. Я зноў вярнулася ў Віцебск. Здаецца, гэта быў 2007 год. Мне пашанцавала сустрэцца і з П.М. Явічам. Ён добра памятаў і вельмі падрабязна апавядаў пра тыя часы. Жывы расповед Явіча, канешне ж, эмацыянальна папоўніў мае веды пра вучобу бацькі і пра дзейнасць віцебскага тэхнікума...”[2].

Ствараючы кнігу пра мастака, В.П. Пракапцова, у той час ужо вядомы музыказнаўца, звяртала вялікую ўвагу і на музычныя захапленні свайго бацькі. Нібыта шукала таемны код яе ўласнага прафесійнага выбару. Усё больш знаходзячы пацвярджэнне таму, што сваю дзіцячую мару бацька ўвасобіў у выхаванні дачкі і яе будучай прафесіі.

Сапраўды, душа П.В. Масленікава “ірвалася” не толькі да выяўленчага мастацтва, але і да музыкі. Захапленні музычнымі інструментамі і спевамі не пакідалі яго з дзяцінства. Яшчэ ў час вучобы ў магілёўскай сярэдняй школе ён кіраваў балалаечным аркестрам. Пазней у педтэхнікуме (1929–1931) лёс звёў Масленікава з М.М. Чуркіным, які выкладаў у гэтай установе музыку, а да таго ж кіраваў харавым калектывам і аркестрам народных інструментаў. У гэты перыяд пытанне “Кім стаць: мастаком ці музыкантам?” было для П.В. Масленікава вельмі актуальным.

У Віцебску П.В. Масленікаў паралельна заняткамі ў мастацкім тэхнікуме граў на домры ў аркестры народных інструментаў, што быў

[1] Інтэрв’ю Т. Іваноўскай з В. Пракапцовай у тэлевізійнай студыі праграмы “ВремяАРТ” 08.12.2018 тэлерадыёкампаніі “Віцебск”.

[2] Інтэрв’ю Т. Іваноўскай з В. Пракапцовай у тэлевізійнай студыі праграмы “ВремяАРТ” 08.12.2018 тэлерадыёкампаніі “Віцебск”.

арганізаваны ў музычнай вучэльні. Узгадваючы віцебскі перыяд свайго жыцця, мастак з захапленнем казаў і пра музычны лекторый у гарадскім клубе, і пра духавы аркестр, што граў кожную суботу і нядзелю ў Губернатарскім садзе, і пра гастролі заезджых оперных спявачак і джаз-аркестраў, і пра тапёраў у віцебскіх кінатэатрах. Да і ўвогуле пра тое, што з музыкай яго жыццё было звязана ўвесь час[3].

На чацвёртым курсе Віцебскага мастацкага тэхнікума, у 1938 годзе П.В. Масленікаў трапіў у кола мастакоў, якіх адабралі для работы мастакамі-дэкаратарамі ў Беларускім тэатры оперы і балета. Так ён апынуўся ў Мінску, дзе поўнасцю захапіўся тэатрам. Разам з тым маладога мастака не пакідала жаданне пайсці вучыцца на вячэрняе аддзяленне ў кансерваторыю [2, с. 266]. Глыбокае захапленне П.В. Масленікава як выяўленчым, так і музычным мастацтвам стала тым ядром у душы маладога чалавека, якое вызначыла яго наступную плённую дзейнасць у Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета.

**Шлях у прафесію.** У 1946 годзе, пасля дэмабілізацыі, П.В. Масленікаў зноў вяртаецца ў Мінск, у тэатр. Калі ў мастака нарадзілася дачка Вера, сям'я атрымала пакой у камунальнай кватэры. "Вялікае месца ў ім займалі складзеныя на падаконніку стосы кніг, – узгадвала Вера Паўлаўна. – Гэтыя кнігі былі першымі ў будучай вялікай бібліятэцы бацькі, які ў той час вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Ленінградзе"[4].

На ўсё жыццё Вера запомніла, як аднойчы пасля вяртання з Масквы бацька прывёз ёй падарунак – дапаможнік "Школа ігры на фартэпіяна". Кнігу, якая вызначыла ў далейшым лёс і ўсё яе жыццё. "Дзіцячая памяць зафіксавала асобныя кадры-ўспаміны з таго часу. Мы з татам сядзім у нашым пакоі за вялікім сталом, (...) разглядаем прывезеную «Школу ігры на фартэпіяна» пад рэдакцыяй Мікалаева. (...) У той час да «Школы» прыкладваўся яшчэ і вялікі ліст-укладыш з намаляванай на ім клавіятурай раяля. На кожнай клавішы была падпісана назва ноты, акрэслены актавы і таксама дадзены іх назвы". Каб да канца разабрацца ў методыцы навучання, Павел Васільевіч спачатку сам асвоіў нотную грамату па папяровай клавіятуры, а пасля стаў тлумачыць яе Веры і асвойваць на практыцы. Піяніна ў доме з'явілася пазней, яго купілі перад паступленнем Веры ў падрыхтоўчы клас музычнай школы пры кансерваторыі.

Калі да Масленікавых прыходзілі госці, пасля застолля Веру ўсаджвалі за піяніна. "Нярэдка бывалі ў нас сябры таты, яго аднакурснікі па Віцебскаму мастацкаму тэхнікуму. Сярод іх ці найчасцей Пётр Рама968ўскі. Яны сядзелі за сталом, размаўлялі, часта ўзгадвалі гады вучобы. Тады, здаецца, я ўпершыню пачула пра Віцебск і мастацкі тэхнікум..."[5].

Вялікім шчасцем для сям'і стала перасяленне з камунальнай у асобную двухпакаёвую кватэру ў новым доме на вуліцы Чычэрына, 3. Нягледзячы на тое, што ў тэатры ў Масленікава была даволі прасторная майстэрня, але і дома стаяў эцюднік, палотны для таго, каб у любую хвіліну ўзяцца за пэндзаль, ці "вырвацца" на эцюды... "Аднойчы, калі я захварэла, бацька ўзяў эцюднік і пачаў пісаць мой партрэт, ён так і застаўся незавершаным..." [2, с. 31].

У новай кватэры галоўнае, самае ганаровае месца займала піяніна. "Гэты інструмент, нямецкай вытворчасці, тата купіў у савецкага генерала, які прывёз яго з Германіі. Знешне вельмі прыгожае піяніна было выраблена з чырвонага дрэва, а да таго ж мела поўную клавіятуру і тры педалі, што ў цэлым адпавядала характарыстыцы канцэртнага раяля"[6].

Сярэдняя спецыяльная музычная школа пры Белдзяржкансерваторыі, у якой вучылася Вера, патрабавала вялікай аддачы, патрэбна было шмат часу займацца. Нават паездкі з бацькамі на адпачынак не вызвалялі ад заняткаў музыкай. "Тата заўсёды загадваў мне браць з сабой ноты. Я мусіла займацца, разбіраць новыя нотныя тэксты", – узгадвала В.П. Пракапцова[7]. "У музычнай школе-адзінаццацігодцы займалася дастаткова шмат «тэатральных» дзяцей. Мы жылі побач і разам вучыліся, часам з розніцай ва ўзросце ў адзін-два гады. (...) Нашы бацькі былі таленавітымі, творча адоранымі людзьмі. І яны хацелі бачыць у нас, іх дзецях, свой працяг" [2, с. 58].

"Памятаю, што калі я была школьніцай сярэдніх гадоў, мы з татам часта прыязджалі да яго дваюроднага брата Васілія Паўлавіча, які жыў у Віцебску? Гэта былі цікавыя паездкі"[8].

**Ад практыкі да тэарэтычных даследаванняў.** Паступленне ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю і вучоба па класе фартэпіяна сталі лагічным працягам выбранага прафесійнага шляху. "Недзе на чацвёртым курсе кансерваторыі тата падарыў мне раяль «Blutner». Гэты інструмент, як і папярэдняе піяніна, таксама аказаўся выдатнай якасці і стварыў для мяне ўсе ўмовы для прафесійных

[3] Запіс інтэрв'ю аўтара артыкула з В. Пракапцовай, кастрычнік, 2014.
[4] Там жа.

[5] Запіс інтэрв'ю аўтара артыкула з В. Пракапцовай, кастрычнік, 2014
[6] Там жа.
[7] Там жа.
[8] Інтэрв'ю Т. Іваноўскай з В. Пракапцовай у тэлевізійнай студыі праграмы "ВремяАРТ" 08.12.2018 тэлерадыёкампаніі "Віцебск".

заняткаў музыкай. Але ў гэты час мяне прыцягвала і тэорыя музыкі, хацелася займацца навуковай дзейнасцю...” [9].

“Яшчэ ў школе пры Белдзяржкансерваторыі Верачка Масленікава была зорным піянерскім прыкладам для нас, першаклашак, – узгадвае доктар мастацтвазнаўства, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі В.У. Дадзіёмава. – Выдатніца, камсамолка, прыгажуня – гэта ўсё пра яе ў наступныя гады. Недасягальная вышыня яе поспехаў натхняла нас і ў кансерваторыі, дзе Вера, зноў жа выдатніца, кіравала грамадскай працай. Кіравала праведна, сумленна і адкрыта, без уласцівай таму часу кан’юнктурнай выправкі. Сведчанне таму – яе прафесійны шлях, далёкі ад кар’ерных узлётаў”[10].

Паступленне В.П. Масленікавай у аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР і праца над дысертацыяй у сектары музычнага мастацтва пад кіраўніцтвам Б.С. Смольскага сталі паваротным этапам у яе прафесійнай дзейнасці. Гэта быў сапраўды новы праект арганізацыі яе ўласнага жыцця, накіраваны на самаразвіццё і самарэалізацыю. Інтэлектуальная праца ўсё больш прыцягвала В.П. Пракапцову. “Цікава, што я неаднойчы ў гэты час задумвалася над тым, што я вучуся у той жа аспірантуры, у якой у 1953–1957 гадах вучыўся без адрыву ад вытворчасці і мой бацька, – узгадвала В.П. Пракапцова, – і гэта накладвала на мяне асаблівую адказнасць. Мне было 13 гадоў, калі бацька абараніў дысертацыю. І я памятаю, што гэта было сапраўднай падзеяй у нашай сям’і”[11].

“У час вучобы ў аспірантуры я неаднойчы прыязджала ў віцебскі архіў, збірала матэрыял для сваёй кнігі «Спасціжэнне майстэрства». Тут я знайшла многа цікавых і карысных матэрыялаў, якія да таго не былі апублікаваны і былі не вельмі вядомыя...”[12]. Аналізуючы гісторыю развіцця і станаўлення мастацкай адукацыі ў Беларусі ў сваёй кнізе, В.П. Пракапцова асаблівую ўвагу надае школе жывапісу Ю. Пэна, развіццю мастацкіх і музычных устаноў у Віцебску ў першай палове XX стагоддзя, “феномену мастацкага Віцебска” ў цэлым [3, с. 135].

Пасля завяршэння аспірантуры з 1975 па 1978 год В.П. Масленікава працуе малодшым навуковым супрацоўнікам у сектары, а затым у аддзеле музычнага мастацтва ІМЭФ АН БССР. У размове з аўтарам гэтага артыкула яна ўзгадвала, што ў тыя гады значна пашыралася тэматыка даследаванняў. Свой уклад у распрацоўку магістральных навуковых тэм уносілі не толькі навуковыя супрацоўнікі, але і аспіранты аддзела.

У 1978 годзе ў Кіеве, у Інстытуце этнаграфіі, мастацтвазнаўства і фальклору імя М. Рыльскага АН УССР В.П. Масленікава абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму “Роля музычнай адукацыі ў станаўленні музычнай культуры Беларусі” [4]. А праз год Вера Масленікава становіцца Пракапцовай. “Мы пазнаёміліся з Верай, калі я пасля заканчэння аспірантуры ў тым жа інстытуце працаваў у сектары выяўленчага мастацтва на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка. Калектывам выязджалі ў падшэфную гаспадарку нарыхтоўваць кармы, вандравалі па гістарычных мясцінах Беларусі. Кіраўнік акадэмічнага калектыву Вольга Фёдараўна Нячай як зводная маці пазнаёміла мяне з Верай, і хутка мы пажаніліся”[13].

У 1979 г. В.П. Пракапцова перайшла працаваць у Мінскі інстытут культуры, як у той час называўся Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, спачатку на пасаду выкладчыка кафедры тэорыі музыкі і фартэпіяна, пазней загадчыка гэтай кафедры. У 1993 годзе ў сувязі з ліквідацыяй кафедры фартэпіяна яна больш за паўтара гады працуе дацэнтам кафедры эстраднай музыкі.

**Вектары рэалізацыі навуковага і педагагічнага патэнцыялу.** З 1994 года В.П. Пракапцова становіцца загадчыкам кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры. Вялікую ўвагу яна надае адкрыццю пры кафедры магістратуры па спецыяльнасці “Мастацтвазнаўства” і аспірантуры па спецыяльнасці “Тэорыя і гісторыя мастацтва”. Уласнаручна распрацоўвае тэматыку магістарскіх, дапамагае патэнцыяльным кіраўнікам аспіранцкіх даследаванняў сфармуляваць праблему і тэму дысертацыі.

У 1997 годзе В.П. Пракапцовай прысвойваецца званне “прафесар”. У хуткім часе яна пачынае працу над доктарскай дысертацыяй на тэму “Мастацкая адукацыя ў Беларусі: сацыялагічны аспект”, якая будзе паспяхова абаронена ў 2000 г. У кантэксце аналізу развіцця прафесійнай музыкі роля навуковых даследаванняў В.П. Пракапцовай будзе адзначана вельмі лаканічна: “упершыню вырашаюцца праблемы музычнай і мастацкай адукацыі ў Беларусі, зроблены гістарычны агляд яго розных форм і дадзены рэкамендацыі па ўдасканаленні працэсу

[9] Запіс інтэрв’ю аўтара артыкула з В. Пракапцовай, кастрычнік, 2014.
[10] З успамінаў В.У. Дадзіёмавай, чэрвень, 2022.
[11] Запіс інтэрв’ю аўтара артыкула з В. Пракапцовай, кастрычнік, 2014.
[12] Інтэрв’ю Т. Іваноўскай з В. Пракапцовай у тэлевізійнай студыі праграмы “ВремяАРТ” 08.12.2018 тэлерадыёкампаніі “Віцебск”.
[13] З інтэрв’ю з У.І. Пракапцовым. Запіс 2022 г.

адукацыі ва ўмовах сучаснага развіцця грамадства" [5].

У пачатку 2000-х гг. В.П. Пракапцова распрацоўвае тэорыю і метадалогію спецыялізацыі "кампаратыўнае мастацтвазнаўства" [6], па якой кафедра пачынае ажыццяўляць набор студэнтаў. Згодна з планам гэтай спецыяльнасці прадугледжваецца вывучэнне гісторыі і тэорыі ўсіх відаў мастацтва: музычнага, тэатральнага, выяўленчага, кіна- і тэлемастацтва, фотамастацтва. І зноў Прафесар з захапленнем распрацоўвала тэматычнае поле магчымых мастацтвазнаўчых даследаванняў, дапамагала магістрантам і аспірантам вызначаць найбольш цікавыя і арыгінальныя шляхі даследавання беларускай культуры ў рэчышчы кампаратывістыкі [7].

З 2001 года В.П. Пракапцова ўзначальвае навукова-педагагічную школу "Тэорыя і гісторыя мастацтва. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства". У складзе гэтай школы працавала 12 дактароў і 55 кандыдатаў навук. У рамках навуковых праграм школы асноўная ўвага надавалася пытанням сінтэзу відаў, стыляў і жанраў мастацтва як у гістарычнай рэтраспектыве, так і ў сучасным кантэксце.

Аўтар унікальных прац па мастацтвазнаўстве, яна шмат зрабіла для беларускай гуманітарыстыкі. За доўгія гады сваёй навуковай працы і педагагічнай дзейнасці выхавала не адну плеяду беларускіх вучоных-мастацтвазнаўцаў. Вера Паўлаўна Пракапцова падрыхтавала трох дактароў і дваццаць два кандыдаты мастацтвазнаўства, сярод якіх ёсць і выхадцы з Віцебску.

З 2003 па 2008 год В.П. Пракапцова з'яўлялася сакратаром экспертнай рады па мастацтвазнаўстве і культуралогіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, а пазней і яе старшынёй (2009–2012). Адначасова працавала сакратаром (1998–2001) і старшынёй (з 2014) савета па абароне доктарскіх дысертацый па спецыяльнасці "Тэорыя і гісторыя мастацтваў" пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, уваходзіла ў склад саветаў па абароне доктарскіх дысертацый пры ўстанове адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" і Нацыянальнай акадэміі мастацтваў імя Т. Жургенава ў Алматы (Рэспубліка Казахстан).

Вялікі пласт педагагічнай і навуковай дзейнасці В.П. Пракапцовай звязаны з навучаннем у БДУКіМ кітайскіх студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Кітайскія аспіранты – жонка і муж – Янь Мэн і Чааламэн сталі апошнімі аспірантамі, якія прайшлі ўвесь працэс падрыхтоўкі да абароны кандыдацкай дысертацыі пад кіраўніцтвам В.П. Пракапцовай. Але, на жаль, абаранялі свае дысертацыі ў 2022 годзе ўжо без свайго горача любімага навуковага кіраўніка. "У ліпені 2016 года мы скончылі магістратуру БДУКіМ, і ў гэтым жа годзе пачалі вучыцца ў аспірантуры па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя мастацтва». Нам пашанцавала, таму што ў самы адказны перыяд навучання за мяжой мы сустрэлі Веру Паўлаўну і сталі яе вучнямі. Яна стала для нас самым блізкім чалавекам у Беларусі, з якім мы дзяліліся сваімі праблемамі, радасцямі і творчымі поспехамі, з якім разам хадзілі на канцэрты... Мы вельмі ўдзячныя лёсу за сустрэчу ў чужой краіне з такім добрым, шчырым, удумлівым і адукаваным вучоным! Мы часта ўспамінаем той час, калі мы абмяркоўвалі структуру, разнастайныя пытанні дысертацыі з нашым навуковым кіраўніком... З самага пачатку мы дрэнна ведалі рускую мову, не разумелі, з чаго пачаць працу над даследаваннем. Але Вера Паўлаўна ніколі не ставілася да нас грэбліва з-за нашага ўзроўню валодання рускай мовай, ніколі не ставіла пад сумнеў нашы даследчыя здольнасці, заўсёды падбадзёрвала нас, часта дзялілася з намі каштоўным жыццёвым досведам. Вера Паўлаўна не толькі вельмі ўважліва чытала нашы працы, але і цярпліва тлумачыла нам кожнае пытанне і нават старанна выпраўляла кожную памылку. Але Вера Паўлаўна добра ставілася не толькі да нас, але і да ўсіх кітайскіх і беларускіх студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў! Яна адносілася да ўсіх аднолькава і была гатова дапамагчы ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу"[14].

Вера Паўлаўна з'яўлялася ганаровым прафесарам Дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Чжэньчжоў, КНР (2007), міжнародным экспертам Расійскага гуманітарнага навуковага фонду па мастацтвазнаўстве (Масква, 2014), членам Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў (1998).

Вядомы айчынны вучоны В.П. Пракапцова выступала з дакладамі, лекцыямі і майстар-класамі ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы, Казахстане, Сербіі, Украіне, Беларусі, Расіі. Уваходзіла ў склад рэдакцыйных калегій шэрагу навуковых часопісаў: "Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў", "Артэфакт", "Мастацкая адукацыя і выхаванне" і інш.

Вера Паўлаўна – аўтар 5 манаграфій, раздзелаў у шэрагу шматтомных выданняў, больш за 300 навуковых артыкулаў і

[14] З успамінаў Чааламэна і Янь Мэна, чэрвень 2022 г.

навукова-метадычных работ. Адным з апошніх вялікіх навуковых выданняў, арганізаваных і ўзначаленых В. Пракапцовай, стала апублікаваная ў 2018 годзе калектыўная манаграфія выкладчыкаў кафедры “Современное искусство Республики Беларусь: справочник персоналий” [8]. Больш за 500 біяграфічных артыкулаў пра вядучых дзеячаў музычнага, тэатральнага, выяўленчага, экраннага мастацтва Беларусі канца XX – пачатку XXI стагоддзя прапануе дадзены даведнік, таксама ў ім змяшчаецца нямала персаналій ураджэнцаў Віцебску, цяперашніх віцяблян.

“Вера Паўлаўна не толькі «зрабіла» сябе – дасягнула вышынь у навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці, стварыла сваю навукова-педагагічную школу кампаратыўнага мастацтвазнаўства, якая стала вядома далёка за межамі нашай краіны, але і выхавала не адно пакаленне вучоных-мастацтвазнаўцаў, у тым ліку і мяне як мастака, мастацтвазнаўцу і дырэктара музея”, – адзначае У.І. Пракапцоў[15].

Вера Паўлаўна Пракапцова ўзнагароджана ордэнам Святой Прападобнай Еўфрасінні Полацкай (2000), ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства культуры “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” (2015), медалём Францыска Скарыны (2016).

**Трыгеры творчых і навуковых кантактаў.** У канцы 1970-х гг. некалькі разоў Віцебск наведваў заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР (1954) Павел Васільевіч Масленікаў. Яго запрашалі старшынёй Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі на мастацка-графічны факультэт у той час Віцебскага педінстытута. Аўтар дадзенага артыкула меў магчымасць на працягу некалькіх дзён прысутнічаць на абароне дыпломных работ, слухаць выступленні старшыні, яго каментарыі, назіраць за паводзінамі славутага мастака і мастацтвазнаўцы. Але наўрад ці мог прадбачыць прызнаны жывапісец, што праз некалькі дзесяцігоддзяў гэта “эстафета” сяброўства і кантактаў з Віцебскам будзе ўдала працягнута яго таленавітай дачкой.

У 2014 годзе ў сувязі са святкаваннем 100-годдзя з дня нараджэння Паўла Васільевіча Масленікава, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, у Віцебску праводзіўся шэраг мерапрыемстваў, у якіх самы актыўны ўдзел прыняла і В.П. Пракапцова. На будынку віцебскага мастацкага тэхнікума па вуліцы Суворава, 3 адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі П.В. Масленікаву (аўтар Павел Лук). Мемарыяльная дошка была зроблена на сродкі Веры Паўлаўны, якая спецыяльна для гэтага прадала адной з вядомых галерэй партрэт, які быў напісаны з яе П.В. Масленікавым. На ўрачыстым адкрыцці дошкі В.П. Пракапцова “зазначыла, што гады, праведзеныя яе бацькам у Віцебску, безумоўна, мелі ўплыў на яго далейшы лёс. У вучылішчы былі закладзены базавыя веды, што дазволіла раскрыцца вялікаму таленту. Па яе словах, Павел Васільевіч часта ўспамінаў час насычанага студэнцкага жыцця, вучобу, працу ў бібліятэцы, паходы на танцы. З вялікай удзячнасцю ён узгадваў сваіх настаўнікаў, асабліва Івана Ахрэмчыка, які прывіў яму любоў да прыроды” [9].

Тады ж у памяшканні Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна ў межах мастацкага праекта “Вяртанне ў Віцебск” (куратар М. Цыбульскі) адбыліся адкрыццё мастацкай выстаўкі Паўла Масленікава “Прастора сцэны” і прэзентацыя дзвюх кніг Веры Паўлаўны пра свайго бацьку. В.П. Пракапцова прыняла таксама ўдзел і ў прэзентацыі памятнага канверта з маркай, прысвечанага П.В. Масленікаву, падрыхтаванага Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і РУП “Белпошта”.

Неаднойчы прыязджала В.П. Пракапцова ў Віцебск на адкрыццё выстаў свайго мужа – У.І. Пракапцова. “Яны добра глядзеліся побач, Богам было наканавана ім ісці поруч, яны дапаўнялі адно аднаго... (...) Мне здаецца, што Вера Паўлаўна не толькі як жонка, але як і творчы і навуковы чалавек сфарміравала Уладзіміра Іванавіча як асобу, як мастака і мастацтвазнаўцу. Ведаю, што Вера была першым і галоўным рэцэнзентам яго жывапісных твораў і навуковых артыкулаў і кніг” [10]. Выпускнік мастацка-графічнага факультэта У.І. Пракапцоў на працягу многіх гадоў з асаблівым піетэтам заяўляў, што ганарыцца сваёй прыналежнасцю да віцебскай мастацкай школы. І як генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, і проста як мастак, ён разам са сваімі аднакурснікамі не аднойчы арганізоўваў у Віцебску выставы ў гонар альма-матар, на вернісажах якіх часта прысутнічала і Вера Паўлаўна. “Дарэчы, заўсёды дзівіла арганіка іх сямейнага тандэма, у якім Вера старалася быццам адыходзіць на паўкрок, але фактычна ісці наперадзе. Не для зацвярджэння першынства, а для папярэджання і палягчэння шляху мужа і разам з тым забеспячэння тылу”[16].

[15] З інтэрв'ю з У.І. Пракапцовым. Запіс 2022 г.

[16] З успамінаў В.У. Дадзіёмавай, чэрвень, 2022.

Пра гэта кажа і сам У.І. Пракапцоў: “Яна была сапраўным лідарам у сям’і, за ўніверсітэцкай кафедрай, станоўчай энергетыкай, дабрынёй імкнулася дапамагчы сваім родным, калегам, студэнтам. Але гэта ўсё мы зразумелі толькі зараз, калі не стала з намі Веры Паўлаўны – жонкі, маці, калегі…”[17].

За час супрацоўніцтва з кафедрамі мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава Вера Паўлаўна Пракапцова неаднойчы выступала рэцэнзентам праграм па розных мастацтвазнаўчых і культуралагічных дысцыплінах, кансультавала сваіх калег па самых разнастайных пытаннях. Важную ролю яна адыграла ў арганізацыі работы аспірантуры па спецыяльнасці “Тэорыя і гісторыя мастацтва” ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава. Гэта былі не толькі парады і рэкамендацыі вопытнага педагога, але і рэальная дапамога ў арганізацыі, напрыклад, атэстацыі аспірантаў.

Вялікі пласт супрацоўніцтва – апаніраванне кандыдацкіх дысертацый кітайскіх аспірантаў, што праходзілі навучанне ў БДУКіМ па кафедры, якой кіравала Вера Паўлаўна. Віцебскі ўніверсітэт неаднойчы выступаў апаніруючай арганізацыяй, а аўтар дадзенага артыкула экспертам і апанентам па дысертацыях, што рыхтаваліся пад навуковым кіраўніцтвам В.П. Пракапцовай. Яе высокі прафесіяналізм заўжды дапамагаў віцебскім мастацтвазнаўцам вызначыць найбольш правільныя арыенціры і навуковыя прыярытэты ў сучасным мастацтвазнаўстве.

Нашу просьбу пагадзіцца на пасаду намесніка галоўнага рэдактара часопіса “Мастацтва і культура” В.П. Пракапцова ўспрыняла без дадатковых разважанняў: “Калі вам патрэбна падтрымка і дапамога – калі ласка, я гатова”, – сказала яна па тэлефоне і з той хвіліны заўжды была на сувязі.

**Заключэнне.** Як у жыцці многіх айчынных дзеячаў мастацтва першай паловы XX стагоддзя, так і ў лёсе П.В. Масленікава Віцебск адыграў вырашальную ролю. Тут ён атрымаў першую мастацкую адукацыю, тут склаліся яго мастацкія прыхільнасці. Але шмат у чым сваю дзіцячую мару П.В. Масленікаў увасобіў у сваёй дачцы, якая стала сапраўдным пасланцам добрай волі ў развіцці кантактаў з горадам яго юнацтва. Талент і навуковыя захапленні В.П. Пракапцовай былі шматгранныя. Музыка, навука, жывапіс, педагогіка… І ў кожным з гэтых накірункаў яна пакінула грунтоўны аўтарскі след.

[17] З інтэрв’ю з У.І. Пракапцовым. Запіс 2022 г.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Прокопцова, В.П. Витебские пенаты: Павел Масленников и его витебский период / В.П. Прокопцова // Искусство и культура. – 2015. – № 2. – С. 69–74.
2. Прокопцова, В.П. Павел Масленников. Портрет художника в зеркале времени: воспоминания, документы, альбом-каталог / В.П. Прокопцова. – Минск: Мастацкая літаратура, 2012. – 302 с.
3. Пракапцова, В.П. Спасціжэнне майстэрства: станаўленне мастацкай адукацыі ў Беларусі / В.П. Пракапцова. – Мінск: Мінская фабрыка каляровага друку, 2006. – 163 с.
4. Масленикова, В.П. Роль музыкального образования в становлении музыкальной культуры Белоруссии: автореф. дис. … канд. искусствовед.: 17.00.02 / В.П. Масленикова; Ин-т искусствовед., фольклора и этнографии АН УССР. – Киев, 1978. – 25 с.
5. Кулешова, Г.Г. Профессиональная музыка [Электронный ресурс] / Г.Г. Кулешова, Т.Г. Мдивани, Н.А. Ювченко // Государственное научное учреждение “Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси”. Филиал “Институт искусствоведения, этнографии и фольклора имени Кондрата Крапивы”. Отдел музыкального искусства и этномузыкологии. История отдела. – Режим доступа: http://www.imef.basnet.by/muzika.html#. – Дата доступа: 21.04.2022.
6. Прокопцова, В.П. Компаративное искусствоведение: историко-теоретическое обоснование / В.П. Прокопцова // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2007. – № 10. – С. 70–77.
7. Прокопцова, В.П. Тематическое поле искусствоведческих изысканий как фактор развития научно-педагогической школы компаративного искусствоведения в БГУКИ / В.П. Прокопцова // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2020. – № 3. – С. 125–134.
8. Современное искусство Республики Беларусь: справочник персоналий / сост.: В.П. Прокопцова [и др.]; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск: БГУКИ, 2018. – 452 с.
9. Мемарыяльная дошка ў гонар мастака Паўла Масленікава адкрылася ў Віцебску па вуліцы Суворава [Электронный ресурс] // Витебские вести. – 2014. – 3 нояб. – Режим доступа: https://vitvesti.by/kultura/doshka-memaryialnaia-suvorava.html/. – Дата доступа: 01.05.2022.
10. Крэпак, Б. Яна стала прадзюсарам свайго жыцця / Б. Крэпак // Культура. – 2022. – 4 лют. – С. 4.


*Паступіў у рэдакцыю 08.07.2022*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*Вера Масленікава на руках у маці. 1952*



*В. Масленікава з бацькамі*
*і малодшым братам. 1957*



*П. Масленікаў.*
*Партрэт дачкі. 1951*



*У бацькоўскім кабінеце*



*У хатняй бібліятэцы. 1979*



*П. Масленікаў. Партрэт студэнткі*
*Белдзяржкансерваторыі. 1972*




*У час адкрыцця персанальнай карціннай галерэі П.У. Масленікава ў г. Магілёве. 1994*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*В.П. Пракапцова*



*У гасцях у маці У.І. Пракапцова. 2008*



*Павел, Вера, Уладзімір і Антон Пракапцовы. 2017*



*У майстэрні народнага мастака Леаніда Шчамялёва. 2007*



*В.П. Пракапцова ў гістарычным вобразе*



*У.І. Пракапцоў і В.П. Пракапцова каля свайго партрэта работы В.У. Альшэўскага. 2015*



*Т.І. Пракапцова і В.П. Пракапцова*



*Калектыўнае фота выкладчыкаў кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры. 2017*



*Сям'я Пракапцовых і рэктар Беларускай акадэміі музыкі К.М. Дулава. 2018*



*Святкаванне 70-гадовага юбілею В.П. Пракапцовай у БДУКМ. 2017*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА



*Старшыня савета па абароне дысертацый В.П. Пракапцова*



*У час работы савета па абароне дысертацый*



*У кулуарах: В.П. Пракапцова, М.Л. Цыбульскі, Р.Ф. Шаура*





*Прыём у БДУКМ дэлегацыі выкладчыкаў і студэнтаў Юлінскага ўніверсітэта (Кітай)*



*В.П. Пракапцова вядзе экскурсію для дэкана мастацкага факультэта Юлінскага ўніверсітэта*



*В.П. Пракапцова і Р.Б. Смольскі пасля абароны яго кітайскай аспіранткі*



*Янь Мэн, Вера Паўлаўна, Сунь Чанлун, Дун Сяасінь, Чааламэн*





*У.І. і В.П. Пракапцовы з гасцямі з Юлінскага ўніверсітэта (Кітай)*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА







*На адкрыцці мемарыяльнай дошкі П.В. Масленікаву ў Віцебску. 2014*




*У.І. і В.П. Пракапцовы перад адкрыццём выставы П.В. Масленікава ў Віцебску. 2014*



*У.І. Пракапцоў, В.П. Пракапцова, П.І. Лук, У.У. Васюк, М.Л. Цыбульскі*



*В.П. Пракапцова і П.І Лук*



*М.Л. Цыбульскі, В.П. Пракапцова, У.І. Пракапцоў*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА





*Прэзентацыя канверта з маркай і кніг В.П. Пракапцовай пра П.В. Масленікава*



*Урачыстае гашэнне канверта з маркай*



*Выступленне мастака тэатра А.А. Салаўёва на адкрыцці выставы П.В. Масленікава*



*Арганізатары і госці на вернісажы выставы П.В. Масленікава "Прастора сцэны". Віцебск, 2014*

# ІЛЮСТРАЦЫІ ДА АРТЫКУЛА М.Л. ЦЫБУЛЬСКАГА





*На вернісажы У.І. Пракапцова ў Віцебскім мастацкім музеі. Кветкі для музы. 2015*




*Пасля адкрыцця выставы У.І. Пракапцова “Мой Віцебск”. 2015*



*М.Л. Цыбульскі, У.У. Васюк, В.П. Пракапцова*



*М.А. Гугнін, В.П. Пракапцова, А.Г. Лісаў*



*М.І. Анцімонава і В.П. Пракапцова*